# Янка Брыль

(1917—2006)



*У. Тоўсцік.* Янка Брыль

1. Якія творы Янкі Брыля вы чыталі ў папярэдніх класах або самастойна?
2. Чым блізкія лёсы самога пісьменніка і яго героя Даніка Мальца?

«Вышэй за ўсё і перш за ўсё — чалавечнасць». Можна лічыць, што гэта выказванне — жыццёвы і творчы дэвіз пісьменніка Янкі Брыля.

У VII класе вы пазнаёміліся з аповесцю «Сірочы хлеб», якая паводле свайго псіхалагізму, пранікнення ў свет заходнебеларускага хлапчука Даніка Мальца, бадай, не мае сабе роўных у айчыннай літаратуры. Твор пра сірочае маленства аўтабіяграфічны ў сваёй аснове. Пісьменнік Янка Брыль і сам адзначаў гэта, гаворачы: «Данік з “Сірочага хлеба”, вядома, не я, а тып або заяўка на яго, мілы сябар майго маленства...»

> «Гэты хлопец — ***Брыль-Ян-т*** беларускай літаратуры» *(Кузьма Чорны).*

«Першае маленства» будучага народнага пісьменніка Беларусі Янкі (Івана Антонавіча) Брыля прайшло ў Адэсе, дзе працаваў яго бацька-чыгуначнік і куды ў час Першай сусветнай вайны выехала сям’я. Тут і нарадзіўся 4 жніўня 1917 года апошні з дзесяці дзяцей Антона Данілавіча і Анастасіі Іванаўны Брылёў — Янка.

Па бацькавай лініі Янка Брыль атрымаў у спадчыну высокі рост, шырокія плечы, музычны слых і любоў да спеваў, вясёлы нораў, лагоднасць і памяркоўнасць характару. А вось неабходныя мастаку ўзвышанасць, імкненне да духоўнага і ідэальнага, сама патрэба змяняць свет з дапамогай слова перадаліся яму ад маці і яе роду.



Правообладатель Национальный институт образования

На пятым годзе жыцця Янка Брыль апынуўся ў Беларусі, у вёсцы Загора (цяпер Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці, на той момант вёска знаходзілася ў Заходняй Беларусі).

! Частка Беларусі ў 1921 годзе ў выніку Рыжскага мірнага дагавора адышла да Польшчы. У Заходняй Беларусі ўсталяваліся жорсткія парадкі: урад Польшчы не прызнаваў беларусаў за нацыю, вёў прымусовае апалячванне, забараняў беларускамоўныя школы, абмяжоўваў права беларусаў на вучобу, друк, бібліятэкі, таварыствы.

Гэта «другое маленства», што ўвайшло ў памяць і ўразіла хлопчыка хараством беларускай прыроды, арыгінальнасцю нацыянальных звычаяў, прыгажосцю роднага слова.

Янку Брылю было ўсяго шэсць з паловай гадоў, калі памёр бацька. Маці з дзецьмі засталася адна. «Маленства маё, апошняга пестуна і любімчыка, працягвалася пры ёй, — як пазней зазначыць пісьменнік у аўтабіяграфіі, — вечна занятай, строгай, але і справядліва добрай, маёй матулі». І пра «сірочы хлеб» больш думала Анастасія Іванаўна. Яна ж яшчэ да школы навучыла сына чытаць. Вельмі хутка чытанне, кнігі сталі найбольшым захапленнем яго маленства, а потым і юнацтва. Успамінаючы пра «дружбу з кнігай», Янка Брыль пісаў: «З маленства люблю кнігу. Чытаць — гэта і праца, і свята». Сярод кніжнага мора, прачытанага Янкам, вылучыўся ідэал, духоўны настаўнік жыцця — Леў Мікалаевіч Талстой. А вось літаратурным аўтарытэтам быў, па ўласным прызнанні Янкі Брыля, Антон Паўлавіч Чэхаў.

Янка Брыль адзначаў у аўтабіяграфіі: «З чатырнаццаці год за сталага працуючы ў гаспадарцы, я многа чытаў, настойліва займаўся самаадукацыяй… многія ночы праседжваў над першымі творамі».

У 1931 годзе пісьменнік скончыў у мястэчку Турэц польскую сямігодку і паступіў у Навагрудскую гімназію, але не змог вучыцца з-за цяжкага матэрыяльнага становішча.

У школе яму пашанцавала на добрых настаўнікаў. Марыя Панеўская, настаўніца будучага пісьменніка, стала прататыпам галоўнай гераіні аповесці «Сірочы хлеб».



Правообладатель Национальный институт образования

У 1939 годзе юнак стаў польскім вайскоўцам. Неўзабаве пачалася Другая сусветная вайна. Гітлераўская Германія напала на Польшчу, і марскі пехацінец Янка Брыль удзельнічаў у абарончых баях пад Гдыняй. Там і трапіў у нямецкі палон. З першых дзён палону ён выношваў думку пра ўцёкі з фашысцкай няволі. І толькі з другога разу ўдалося ўцячы, вярнуцца ў роднае Загора, якое знаходзілася пад акупацыяй.

У аўтабіяграфічным нарысе «Думы ў дарозе» Я. Брыль пісаў пра сваю настаўніцу так: «Прыгожая, па-мацярынску абаяльная і светлая душой, яна вучыла нас, заходнебеларускіх пастушкоў, любіць высокае, сапраўднае ў паэзіі і ў песні польскага народа, прадстаўнікоў якога найчасцей мы бачылі прыгнятальнікамі».

У 1942 годзе Янка Брыль стаў сувязным партызанскай брыгады, а ў 1944 — разведчыкам. Восенню гэтага ж года ён ужо быў прызнаным партызанскім журналістам і пісьменнікам.

Пасля вызвалення Беларусі пераехаў у Мінск і ўзначаліў рэдакцыйны аддзел часопіса «Вожык». З гэтага часу лёс Янкі Брыля непарыўна звязаны з Мінскам. Тут былі напісаны лепшыя кнігі, у якіх адлюстравалася ўласна перажытае, тое, што з'яўляецца часткай біяграфіі яго самога. Але гэта не значыць, што пісьменнік будаваў свае творы толькі на біяграфічным матэрыяле.

Яшчэ маленькім хлапчуком Янка Брыль адчуў, што літаратура — яго «чароўны і святы абавязак жыцця». Першы верш будучы пісьменнік напісаў у дзевяць гадоў. Дакладней, ён быў не напісаны, а складзены, бо адбылося гэта на пашы. Але, пачаўшы сталець, Брыль-падлетак пацягнуўся ад вершаў да «празаічнага чорнага хлеба», як зазначыла Юлія Канэ, і да беларускага роднага слова, што пахла для яго тым самым хлебам. Проза паступова брала сваё.

Першыя яго публікацыі з'явіліся ў 1938 годзе ў часопісе «Шлях моладзі». Пачаткам сваёй пісьменніцкай дзейнасці сам Я. Брыль неаднойчы называў апавяданне «Марыля», ім ён адкрыў сваю доўгачаканую **першую кнігу «Апавяданні»** (1946). Брыль стаў адным з найбольш прызнаных беларускіх апавядальнікаў. Празаік і сам падкрэсліваў у аўтабіяграфіі: «Люблю пісаць апавяданні. Здаецца нават часамі, што на любую тэму магу глядзець толькі праз прызму малое формы».


Правообладатель Национальный институт образования







Вокладка і тытульны ліст кнігі Я. Брыля «Парастак»

Пісьменнік шырокага творчага дыяпазону, Янка Брыль пісаў апавяданні, аповесці, мініяцюры, нарысы, эсэ, стварыў раман... У жанры мініяцюры Я. Брыль выявіў сябе сапраўдным майстрам. Пачаў ствараць іх з сярэдзіны 1960-х гадоў (зборнікі «Жменя сонечных промняў», «Сёння і памяць», «На сцежцы — дзеці», «Вячэрняе» і інш.), а развітаўся ён са сваімі чытачамі кнігай «Парастак» (2006), якую за два тыдні да смерці паспеў з аўтографамі (з дапамогай дачкі, Наталлі Іванаўны Семашкевіч) разаслаць блізкім, сябрам, калегам.

У юнацтве Янка Брыль, па яго ўласным прызнанні, марыў быць дзіцячым пісьменнікам. «Захапляцца маленствам, наогул пачаткам жыцця, пісаць пра гэта — найцікавей», — зазначаў ён у «Думах у дарозе». Ужо якое пакаленне дзяцей і моладзі выхоўваецца на брылёўскіх творах: «Сірочы хлеб», «Ліпка і клёнік», «Сняжок і Волечка», «Жыў-быў вожык», «Зялёная школа» і інш. Але ці не галоўным творам класіка можна лічыць шмат у чым аўтабіяграфічны раман пра Вялікую Айчынную вайну «Птушкі і гнёзды».

Унікальнай у сусветнай літаратуры стала і створаная Янкам Брылём разам з Алесем Адамовічам і Уладзімірам Калеснікам дакументальная кніга «Я з вогненнай вёскі...» — жудасныя ўспаміны ўцалелых жыхароў спаленых вёсак Беларусі, жорсткая і страшная праўда пра вайну і фашызм. Тэма Вялікай Айчыннай вайны з’яўляецца скразной у зборніках апавяданняў пісьменніка «Ты мой лепшы друг», «Надпіс на зрубе» і інш.


Правообладатель Национальный институт образования

Адной з адметнасцей прозы Я. Брыля даследчыкі называюць аналітызм і глыбокі псіхалагізм, немагчымыя без пільнай увагі да мастацкай дэталі.

Вучыўся пісьменнік сакрэтам творчага майстэрства, як ён сам сцвярджаў гэта неаднаразова ў сваіх мініяцюрах, у Гогаля, Дастаеўскага, Талстога, Чэхава, Чорнага.

Чалавечнасць — вось што вызначала асобу Брыля-творцы, грамадзяніна. У жыцці і творчасці пісьменнік кіраваўся маральным прынцыпам, выказаным у адной з мініяцюр: «Я магу памыляцца шмат у чым, у жыцці маім было нямала меншых і большых памылак, але адно я ведаю цвёрда: вышэй за ўсё і перш за ўсё — чалавечнасць». Пра гэту людскасць, чалавечнасць, дабрыню, годнасць, самаахвярнасць пісаў ён у творах.

Формула шчасця Янкі Брыля: «Два найвышэйшыя званні — пісьменнік і чалавек. Адно мне вельмі хочацца набыць, другое — яшчэ больш — не страціць». Самае ганаровае званне — народнага пісьменніка БССР — Янка Брыль атрымаў у 1981 годзе.

Сваю літаратурную творчасць Я. Брыль часта называў служэннем Слову. Усё, што створана ім за гады творчай дзейнасці, складае неацэнны нацыянальны здабытак. Творы Янкі Брыля перакладзены больш чым на 30 моў свету.

Удзячныя нашчадкі ўшаноўваюць памяць народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля. Сёння яго імя нададзена адной з вуліц Мінска і Гдыні (Польшча). Выдаецца збор твораў пісьменніка ў 10 тамах.

А найлепшым помнікам класіку сталі яго творы, у якіх праслаўляецца творчы геній чалавека.

1. Янка Брыль аўтабіяграфію пачаў так: «У мяне было два маленствы». Раскажыце пра іх.
2. Чаму ў творчасці Янкі Брыля тэма Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца скразной? Які ўдзел пісьменнік прымаў у вайне?
3. Звярніцеся да партрэта Янкі Брыля работы Уладзіміра Тоўсціка. Якім паўстае на партрэце наш славуты празаік?
4. Пазнаёмцеся з нарысам Янкі Брыля «Мой радавод». Як пашырылася ваша ўяўленне пра асобу творцы і тое асяроддзе, якое спрыяла станаўленню яго таленту?



Правообладатель Национальный институт образования

5. Памяць пра пісьменнікаў жыве ў творах літаратуры і мастацтва, а таксама на паштоўках і канвертах. Так, да 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Брыля (2017) быў выпушчаны канверт з арыгінальнай маркай Беларусі. Сёння асаблівую папулярнасць у свеце набыла з’ява посткросінгу — абмену паштоўкамі паміж жыхарамі розных краін. Уявіце, што вам трэба аформіць і падпісаць паштоўку свайму замежнаму сябру, у якой варта адзначыць, чым вас уразілі творы знакамітага літаратара, якія думкі выклікалі.




6. Разгадайце крыжаванку «Біяграфія Янкі Брыля».

## Апавяданне «Memento mori»

Задуму апавядання «Memento mori» (1958) Янка Брыль выношваў доўгі час. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ён даведаўся ад паэта Міхася Васілька пра трагічную смерць іх агульнага сябра Данілы Скварнюка. Гэту гісторыю і выкарыстаў пісьменнік для свайго твора, зрабіўшы героя безыменным вясковым печнікам, каб падкрэсліць тыповасць характару і агульначалавечую сутнасць яго ахвярнай смерці.

Назва апавядання — «Memento mori» (у перакладзе з латыні — ‘памятай пра смерць’) — узята пісьменнікам з антычнай культуры.

Усяго 3 старонкі займае апавяданне, але яно вартае цэлых тамоў.

Трагічныя падзеі ў творы адбываюцца позняй восенню 1943 года. На адным з перагонаў беларускай чыгункі ўзарваўся фашысцкі эшалон. Праз дзень карнікі сагналі жыхароў адной з навакольных вёсак у адрыну, каб там іх пакараць, спаліць.

> ! На тэрыторыі Беларусі фашысты стварылі больш за 260 канцэнтрацыйных лагераў, спалілі і разбурылі каля 5,5 тысяч населеных пунктаў, правялі больш за 140 карных аперацый, у час якіх спалілі 628 вёсак разам з жыхарамі, з іх 186 так і не былі адноўлены пасля вайны.
>
> У Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці, дзе прайшло дзяцінства Я. Брыля, у вёсцы Новае Сяло ў агонь трапіла 214 безабаронных ахвяр. Ды і сам Я. Брыль зведаў на сабе, што азначаў «новы парадак». Таму і ўзненавідзеў пісьменнік фашызм як найвялікшае зло чалавецтва.



Правообладатель Национальный институт образования

У разгар карнай аперацыі з натоўпу зондэрфюрар вылучыў вясковага печніка. Вораг вырашыў «падараваць» старому майстру і яго сям'і жыццё ў знак удзячнасці за добра зробленыя печы. «Бледны, без шапкі на лысіне, абраслы сівеючай шчэццю, ён упёрся ў немца скамянелымі вачыма і маўчаў. Толькі бяскроўныя губы перасмыкаліся, як ад нязбытнага жадання гаварыць». Праз гэты партрэт печніка раскрываецца яго ўнутраны стан. Чалавек жахаецца тут без страху за сябе: яго вочы скамянелі, бяскроўныя губы змоўклі. Стары знямеў ад таго, што тварылі нелюдзі, пасягнуўшы на святасць жыцця. Прыняць літасць ад «звышчалавека» толькі для сябе пячнік не захацеў. Ён захацеў большага: пачаў пералічваць родных, блізкіх, суседзяў, што былі ў адрыне. Фашыст незадаволены, праз перакладчыцу пытаецца, можа, стары хацеў бы забраць адтуль усю банду. Перакладчыца папярэдзіла печніка пра небяспечны з яго боку ход: «Вы, дзядзька, не дурыцеся, калі хочаце жыць. Зараз адрыну падпаляць».

Кульмінацыйны момант апавядання — сцэна дыялогу старога печніка з зондэрфюрарам. У ходзе гэтага дыялогу адбываецца сутыкненне дзвюх маралей, двух светапоглядаў. Гэта фактычна своеасаблівы паядынак чалавека і нелюдзя, агульналюдской філасофіі, этыкі і фашысцкай ідэалогіі.

Дыялог фактычна высвечвае тры характары, бо ўдзельнічаюць у ім двое суразмоўцаў і пасрэдніца — перакладчыца Вера, «істота ў скураным паліто і белай вязанай хустцы», што, звяртаючыся да начальніка, выклікáла на твар «крывое падабенства службова-інтымнай усмешкі». Яна хоча зрабіць выказванні зондэрфюрара больш зразумелымі печніку, спрашчае іх, каменціруе, нешта ўстаўляе ад сябе. Удзел пасрэдніцы дапамагае яшчэ вастрэй выявіць спрадвечны маральны канфлікт паміж людскасцю і нялюдскасцю. Тое, што



▲ Мемарыяльны комплекс «Памяці спаленых вёсак Магілёўскай вобласці» (Кіраўскі раён, в. Баркі)



Правообладатель Национальный институт образования



▲ *У. Міхайлоўскі.* Хатынскі набат

перакладчыца як-ніяк зямлячка, а заняла пазіцыю ворага, аказалася апошняй кропляй, якая вызваліла ў печніку сілы здранцвелай душы: «Пад чорнай навіссю броваў ажылі нарэшце вочы. Губы зусім перасталі дрыжаць. Нібыта не сваю, незвычайным жэстам, пячнік узняў галаву: — А ён што думаў? І ўсіх! Усіх добрых людзей!.. Можа, ён ім раўня — гэты твой гаспадар? Або ты, можа?.. Цьфу!.. Чалавек плюнуў пад ногі, тады павярнуўся і ўжо не тым няпэўным крокам, як сюды, пайшоў да варот адрыны». Просты пячнік выявіў маральную перавагу, хараство душы, выступіў абаронцам «за ўсіх добрых людзей».

Герой гіне фізічна, але ўжо не як бездапаможная ахвяра, а як чалавек, які прымусіў ворага занервавацца і атрымаў над ім маральную перамогу. Горды і непакорлівы, не страціўшы сваёй годнасці, не здрадзіўшы спрадвечным ідэалам, пячнік не пажадаў літасці ка́та. Бо без аднавяскоўцаў, усяго народа не бачыў сэнсу жыцця. У гэтым яго бессмяротнасць.

Мнагазначнасцю вылучаецца загаловак апавядання — «Memento mori». Многія даследчыкі твора Я. Брыля рабілі спробу разгадаць яго сутнасць назвы, па-рознаму тлумачачы выслоўе «памятай пра смерць». «Памяць пра смерць можа адводзіць ад спакусы рабіць памылкі, перасцерагчы, што не хопіць часу на адкупленне віны — жыццё кароткае» *(Уладзімір Калеснік)*. «Чалавек не бессмяротны і павінен пакінуць па сабе добры след на зямлі, каб яго ўспаміналі ўдзячным словам» *(Рыгор Шкраба)*. «Нягодная смерць можа перакрэсліць годнае жыццё» *(Віктар Каваленка)*.

«Memento mori, — пісаў Леў Талстой, — вялікае слова. Калі б мы памяталі пра тое, што мы памром, усё жыццё наша атрымала б зусім іншае значэнне. Чалавек, ведаючы, што ён памрэ праз паўгадзіны, не будзе рабіць ні пустога, ні благога ў гэтыя паўгадзіны. Але паўстагоддзе, якое, можа быць, аддзяляе цябе ад смерці, хіба не тое ж, што паўгадзіны?»



Правообладатель Национальный институт образования

Герой апавядання Янкі Брыля «Memento mori» ведаў, што памрэ праз паўгадзіны ці меней. Дакладней, стары пячнік ведаў, што ён загіне разам з усімі, з самага пачатку. Аднак потым зондэрфюрар вырашыў падараваць яму жыццё. Але стары не прыняў гэтага дару. І выбраў смерць годную. «І ён згарэў — адзін, хто мог бы ў той дзень не згарэць. І ён жыве».

Сваім апавяданнем Янка Брыль сцвердзіў, што чалавек павінен у любых абставінах заставацца маральнай асобай: толькі гэта надае сэнс жыццю.

1. Як вы думаеце, чаму ў апавяданні няма назвы вёскі?
2. Якімі ідэаламі і справамі жыў пячнік?
3. Як вы мяркуеце, чаму бездапаможны пячнік мае маральную перавагу над зондэрфюрарам?
4. Вызначце, якімі мастацкімі сродкамі карыстаецца пісьменнік, каб раскрыць псіхалогію персанажаў апавядання.
5. Ці можна лічыць, што пячнік здзейсніў подзвіг? Паразважайце, ці ёсць месца подзвігу ў нашым штодзённым жыцці.
6. Як у апавяданні раскрываецца антычалавечая сутнасць фашызму?
7. Выканайце творчае заданне «Апавяданне Янкі Брыля “Memento mori”».
8. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Уладзіміра Міхайлоўскага «Хатынскі набат». Ці можна сцвярджаць, што ідэя апавядання адпавядае зместу мастацкага палатна? Свой адказ абгрунтуйце. Паразважайце, аб чым званы Хатыні звоняць сёння.
9. Праслухайце сімфанічную паэму Генрыха Вагнера «Вечна жывыя». Звярніцеся таксама да рэпрадукцыі карціны Анатоля Шыбнёва «Людзі, памятайце Хатынь!». Параўнайце творы музычнага і выяўленчага мастацтва са зместам апавядання «Memento mori». Які з твораў вас найбольш уразіў? Чаму?
10. Згадайце творы беларускай літаратуры, у якіх паказаны чалавек перад знішчальнай сілай абставін. Ці ведаеце вы такія выпадкі з рэальнага жыцця? Напішыце пра гэта невялікае сачыненне.
11. Наведайце мемарыяльны комплекс «Хатынь» ці наладзьце віртуальную экскурсію. Чаму на доўгія гады Хатынскі мемарыял стаў «сімвалам бязмерных выпрабаванняў беларусаў» *(Васіль Быкаў)*?


Правообладатель Национальный институт образования